УДК 2-157:[7.046+2-264](476+48)

# ГЕНЕАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАГА І СКАНДЫНАЎСКАГА ПАНТЭОНА ЯК КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ НАПРАМАК

***Ю. С. Барадзін,***
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца генеалогія язычніцкага пантэона беларускіх і скандынаўскіх багоў як адзін з культуралагічных напрамкаў. Пры аналізе міфалагічнага мінулага народаў генеалогія складае важны аспект гісторыка-культурных даследаванняў. Генеалагічная рэканструкцыя як адна з характарыстык міфалагічнай культуры садзейнічае вывучэнню і разуменню радаслоўнай міфалагічных персанажаў, захаванню памяці аб язычніцкім мінулым. Разнастайныя даследаванні генеалогіі пантэона шматбожжа іграюць вялікую ролю ў сучаснай культуры, дапамагаючы зразумець духоўную культуру народаў, яе падабенства і адрозненне.

**Ключавыя словы:** генеалогія, язычніцкі пантэон, багі, культуралогія, міфалогія, язычніцкае бажаство, скандынаўскія і беларускія міфалагічныя персанажы, генеалагічная камп'ютарная праграма.

# THE GENEALOGY OF THE BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN PANTHEON AS A CULTURAL DIRECTION

***Y. Baradzin,***
*Postgraduate Student of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the genealogy of the pagan pantheon of Belarusian and Scandinavian gods as one of the cultural trends. When analyzing the mythological past of peoples, the role of genealogy as one of the aspects of culture is explored. Genealogical reconstruction, as one of the characteristics of mythological culture, contributes to the study and understanding of the family trees of mythological characters,

preserving the memory of the pagan past. A diverse study of the genealogy of the pantheon of polytheism plays a role in modern culture, while helping to understand the spiritual culture of peoples, their similarities and differences.

**Keywords:** genealogy, pagan pantheon, gods, cultural studies, mythology, pagan deity, Scandinavian and Belarusian mythological characters, genealogical computer program.

Генеалагічныя міфы – навука аб радаводзе і паходжанні язычніцкага пантэона багоў. Карані генеалогіі тлумачаць далёкае мінулае пантэона шматбожжа. Згодна з міфалогіяй, у багоў, як і людзей, ёсць продкі, сям'я і кроўна-сваяцкія сувязі, якія маюць месца ў традыцыйнай і духоўнай культуры народаў. Даследаванне радаслоўнай беларускага і скандынаўскага пантэона мае не толькі навуковы, але і культуралагічны напрамак.

Генеалагічнае дрэва як беларускіх, так і скандынаўскіх багоў мае старажытныя карані ў язычніцкай міфалогіі. У генеалагічных міфах прасочваецца паходжанне родаў пантэона шматбожжа, што спрыяе захаванню памяці аб міфалагічных персанажах і язычніцкім мінулым беларускага і скандынаўскіх народаў. У культуралагічным напрамку адзначаецца цікавасць даследчыкаў да гісторыі радаводаў, выяўлення роднасных сувязей. Генеалагічная рэканструкцыя пантэона вывучае культурныя аспекты пакаленняў і жыцця.

З развіццём і з'яўленнем новых інфармацыйных тэхналогій, Інтэрнэту генеалогія з'яўляецца больш дасягальнай для грамадства. У першай чвэрці XXI ст. з'явіліся камп'ютарныя праграмы-прылады для вывучэння і пабудовы радаслоўнай. Адна з сучасных папулярных генеалагічных камп'ютарных праграм з адкрытым кодам – GRAMPS (сістэма праграмавання для кіравання генеалагічнымі даследаваннямі і аналізам), створаная амерыканскім вучоным Донам Алінгемам і распрацаваная камандай Gramps [11].

Праграма дае магчымасць пабудаваць, візуалізаваць генеалагічныя дрэвы з устаўкай ілюстрацый, на якіх адлюстроўваецца знешні выгляд беларускіх і скандынаўскіх багоў, затым захаваць іх у добрай якасці ў фармаце SVG (маштабаванне вектарнай графікі) для зручнага прагляду карыстальнікамі Інтэрнэту. Ёсць таксама магчымасці перавесці «дрэва» ў графічны фармат для за-

хавання ілюстрацый – jpg альбо ўставіць у рэдактар для працы з дакументамі – doc.

З дапамогай генеалагічнай дыяграмы, створанай у GRAMPS, з выкарыстаннем каранёў і стрэлак праграма тлумачыць, які бог з'яўляецца бацькам, маці, дзядулем, бабуляй, сынам ці дачкой, унукам, праўнукам, працягваючы наступнае пакаленне багоў.

У кожнай язычніцкай міфалогіі паралельна з касмагоніяй (стварэннем космасу багамі з хаосу і пустэчы) ідзе генеалагічны пачатак язычніцкага бажаства. У скандынаўскім язычніцкім пантэоне першыя міфалагічныя персанажы – Буры (продак багоў, бацька аса Бора, дзед Усебацькі Одзіна), і Імір (першы волат, ётун), які, будучы бацькам волата Бёльтарна і дзедам волаткі Бестлы, з'яўляецца прадзедам бога вайны і вікінгаў Одзіна па мацярынскай лініі [3, с. 17]. Дзеля стварэння космасу Одзін і яго браты – Ві і Велі прыносяць у ахвяру свайго прадзеда Іміра, ствараючы з частак яго цела ўвесь сусвет [Там жа, с. 18]. Акрамя таго, што з нашчадкаў Іміра ацалеў яго ўнук – ётун Бергельмір (сын Трудгельміра) [Там жа, с. 23], радавод забітага ётуна (волата) працягваюць Одзін і наступнае пасля яго пакаленне багоў. Нягледзячы на варожасць і суперніцтва паміж волатамі і багамі за забойства Іміра і стварэнне з яго космасу, скандынаўскія багі бяруць шлюбы з багінямі і адначасова з волаткамі. Бог вясны Бальдр і сляпы бог зімы Хёд нарадзіліся ў выніку шлюбу Одзіна з багіняй дзетанараджэння Фрыг. Наступнае пакаленне Одзіна, яго бацькі Бора і дзеда Буры працягваюць Бальдра і яго жонкі – багіні супакою – Наны, і захавальнік праўды, бог-суддзя Фарсэці [Там жа, с. 27].

У скандынаўскай генеалогіі захоўваецца традыцыя шматжонства. Сярод жонак Одзіна волатка Ёрд (Маці-Зямля), сястра Гіміра, Рынд і Грыд, ад якіх нарадзіліся Тор-грамабой [4, с. 25], Цюр (заступнік ваяроў) [3, с. 28], Валі і Відар (багі помсты) [Там жа, с. 27]. Тор быў жанаты адначасова на багіні ўрадлівасці Сіф (іх дзеці: Модзі – бог ваяўнічай лютасці, Труд – валькірыя, Уль – бог зімы) і волатцы Ярнсаксе (іх сын Магні – бог фізічнай сілы) [10, с. 16]. Ярнсакса, жонка Одзіна, уваходзіць у пантэон дзевяці матуль Хеймдаля (вартаўніка багоў) разам з Гьяльп, Грэйп, Ейстлай, Ірґіафай, Ульфрун, Ангейяй, Імд і Атлай. Таксама Тор мае карані ад волатаў па мацярынскай лініі ад бабулі Нот (багіні ночы), бацька якой і прадзед Тора – ётун Нарві (сын бога-волата агню і падману Локі і Сігюн (багіні адданасці). Грамабой таксама

паходзіць ад Локі і яго бацькоў ётунаў Лаўвейі і Фарбаўці [Там жа, с. 17]. Ад Локі і Ангрбоды, якая з’яўляецца ўвасабленнем пакуты і жаху, нарадзіліся хтанічныя пачвары: воўк Фенрыр, змей Ярмунганд, валадарка пекла Хель.

У скандынаўскай генеалогіі Локі часта асацыіруецца з мацярынствам, паколькі ён ажаніўся на кані Свадзільфары і, прыняўшы аблічча кабылы, стаў бацькам васьміногага каня Слейпніра.

Некаторыя са скандынаўскіх багоў паходзяць ад людзей, гэтак жа як людзі паходзяць ад багоў. Напрыклад, дачка Ньёрда (бога ветру) і Скадзі (багіні зімы) Фрэйя (багіня кахання) выйшла замуж за чалавека па імені «Од», і яны нарадзілі Ідун (багіню вечнай маладосці), якая выйшла замуж за Брагі (сына Одзіна, апекуна паэзіі). Ад яе брата Фрэйра (бога сонца, лета і восені) і волаткі Гёрды з’явіўся першы кіраўнік шведскай Упсалы з дынастыі Ілінгаў Ф’ёльнір [3, с. 26].

У беларускай генеалогіі язычніцкага пантэона даюць пачатак Род і яго сыны – Белбог (бог дабра) і Чарнабог (бог зла) [4, с. 197]. Яны разам стварылі космас. Затым Сварог (каваль, бог агню) разам з Ладай (багіняй любові) спарадзілі вярхоўны пантэон [6, с. 119] – Перуна (грамабоя) [4, с. 199], Вялеса (заступніка жывёл) [Там жа, с. 208], Сімаргла (бога агню), Стрыбога (бога ветру), Вышэня (бога неба), Жыву (багіню жыцця і ўрадлівасці), Марэну (багіню смерці), Лёлу (багіню вясны) [7, с. 121]. Ад Дажбога і яго жонкі Златагоркі (багіні нябеснага святла) працягваюць радавод Радагост (бог расліннасці і паветра) і Каляда (бог зімовага сонца) [4, с. 230], а ад Каляды і Радуніцы (багіні сонечнага прамення) – Хорс (бог дзённага святла) [6, с. 185]. Ад Сімагла і Купальніцы (багіні ночы) – Купала, адзін з галоўных багоў пантэона (бог лета) [4, с. 220].

Нягледзячы на тое, што скандынаўскія багі ў адрозненне ад беларускіх – смяротныя, як і людзі, яны аднолькава дбаюць аб працягу і захаванні свайго радавода. З філасофскага пункту гледжання, багі – частка генеалогіі маралі Фрыдрыха Ніцшэ (ніцшэанская генеалогія тлумачыць паходжанне аднаго бога ад іншых багоў), генеалогіі ўлады Мішэля Фуко (багі – такая ж крыніца ўлады, як кіраўнік дзяржавы, і падобна яму перадаюць у спадчыну ўладу наступнаму пакаленню багоў) [5; 8] і юнгаўскіх архетыпаў (Карл Юнг тлумачыць, што пантэон багоў – частка падсвядомасці чалавека, які адчувае духоўную сувязь з бажаством, і сваю прыналежнасць да яго) [9, с. 5]. Продкі беларусаў

бачылі сябе духоўнымі нашчадкамі Дажбога, а продкі скандынаваў (вікінгі) адчувалі сябе сынамі Одзіна і Тора.

Працяг генеалогіі беларускага і скандынаўскага пантэона – іх рэканструкцыя ў рок-музыцы і нефармальнай субкультуры металістаў. Багі вікінгаў узгадваюцца ў музычных гуртах у стылі viking metal [1], які распаўсюджаны не толькі ў краінах Скандынавіі, але і ва ўсім свеце. Скандынаўскія багі «прысутнічаюць» таксама ў кінематографе (у фільмах і серыялах, калі сучасныя акцёры ўвасабляюць вобраз і аблічча пантэона багоў) [2]. Беларускія божаствы ўзгадваюцца ў рок-гуртах напрамку pagan metal [12]. Музыканты, выступаючы на сцэне перад гледачамі, таксама прымаюць выгляд беларускіх багоў, якіх рэпрэзентуюць. Дзякуючы музыцы і кінематографу генеалогія беларускага і скандынаўскага пантэона ўваходзіць і ў сучасную масавую культуру. Мастакі, спрыяючы ўпрыгожанню генеалагічнага дрэва багоў, спрабуюць візуалізаваць і адлюстраваць іх такімі, якімі бачаць, язычніцкі пантэон шматбожжа становіцца часткай выяўленчага мастацтва [6].

Такім чынам, генеалагічная рэканструкцыя беларускага і скандынаўскага пантэона садзейнічае вывучэнню радаводу божастваў дзеля захавання памяці аб язычніцкім мінулым альбо папярэдніх пакаленнях вярхоўнага бога, каб растлумачыць іх месца ў гісторыі, філасофіі, мастацтве, традыцыйнай, духоўнай, інфармацыйнай, тэхналагічнай і масавай культуры таго ці іншага народа, а таксама падтрымцы культурнай спадчыны, захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей і перадачы традыцый з пакалення ў пакаленне.

*1.* Исполнители Viking metal // Музыка Viking metal. – URL: https://www.last.fm/ru/tag/viking+metal/artists (дата обращения: 16.04.2025).

*2. Кожевников, Е.* Какими были Тор, Один и Локи в кино и на телевидении / Евгений Кожевников // КиноРепортер. – 2003. – 4 окт. – URL: https://kinoreporter.ru/nu-i-semejka-kakimi-byli-tor-odin-i-loki-v-kino-i-na-televidenii/ (дата обращения: 13.04.2025).

*3.* Наследники Одина. Предания скандинавских народов средневековой Европы : сб. / в пересказах Е. Балобановой, О. Петерсон ; ил. Д. Гордеева. – СПб. : Азбука, 2016. – 288 с.

*4. Ненадавец, А . М.* Міфалогія маіх продкаў / А. М. Ненадавец. – Чарнігаў : Всесвіт, 2009. – 400 с.

*5. Родионов, Т.* Генеалогия христианства Ф. Ницше / Тарас Родионов // Топос. – 2017. – 15 июня. – URL: https://www.topos.ru/article/ontologicheskie-progulki/genealogiya-hristianstva-f-nicshe (дата обращения: 13.04.2025).

*6.* Скандинавская и славянская мифология в картинах Игоря Евгеньевича Ожиганова. – URL: https://babiki.ru/blog/painting/38182.html (дата обращения: 15.04.2025).

*7. Фамицын, А. С.* Божества древних славян / Ал. С. Фамицын. – М. : Акад. проект : Гаудеамус, 2012. – 303 с.

*8. Фуко, М.* Ницше. Генеология. История / Мишель Фуко. – URL: https://nietzsche.ru/look/xxb/fuko/ (дата обращения: 15.04.2025).

*9. Юнг, К. Г.* Душа и миф: шесть архетипов / Карл Густав Юнг ; пер. с англ. В. В. Наукманова. – М. : Совершенство, 1997. – 383 с.

*10. Gaiman, N.* Mitologia Nordycka / Neil Gaiman ; przełożyła Paulina Braiter. – Warszawa : MAG, 2023. – 228 s.

*11.* Gramps. – URL: https://gramps.softonic.ru/ (дата обращения: 16.04.2025).

*12.* Pagan metal artists // Pagan metal music. – URL: https://www.last.fm/tag/pagan+metal/artists (дата обращения: 15.04.2025).